УДК 808.26 - 3 (043.3)

# Структурная характарыстыка тэрмінаў: на матэрыяле беларускай будаўнічай тэрміналогіі

Пятрова Н.Я., Савіцкая І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічыны ўніверсітэт

Беларуская будаўнічая тэрміналогія аб’ядноўвае спецыяльныя найменні для абазначэння будаўнічых матэрыялаў і вырабаў, прылад працы, механізмаў, машын, прыбораў і прыстасаванняў, тэхналагічных аперацый і вытворчых працэсаў, аб’ектаў жыллёвага прызначэння, асобных памяшканняў і іх элементаў, дэталяў і інш.

Будаўнічыя тэрміны паводле структуры падзяляюцца на:

1) тэрміны-словы (*арка, арматура, бэлька, вежа, вентыляцыя, гараж, дрэнаж, звод, калона, каналізацыя, каркас, лінолеум, падлога, панель, паркет, пліта, рама, рубероид, рэзервуар, тунель* і інш.);

2) тэрміны-словазлучэнні (*аддзелачныя матэрыялы, армакаменныя канструкцыі, асадка грунту, вакуумаванне бетону, воданапорная вежа, вентыляцыя прамысловых будынкаў, галерэя прамысловая, жалезабетонныя канструкцыі, малярныя работы, мантаж будаўнічых канструкцый, прамысловы будынак, тэхніка бяспекі, цеплаўстойлівасць будынкаў* і інш. );

3) тэрміны-абрэвіятуры (*АСТД – адзіная сістэма тэхналагічнай дакументацыі, АЧП – адзнака чыстай падлогі, БНБ – будаўнічыя нормы Рэспублікі Беларусь, БНіП – будаўнічыя нормы і правілы, ДАСТ – дзяржаўны стандарт, ІПК – інжынерныя падземныя камунікацыі, ЖКГ – жыллёва-камунальная гаспадарка, ЖКК – жыллёва-камунальны кааператыў, КВА – кантрольна-вымяральная апаратура, ККД – каэфіцыент карыснага дзеяння, МГН – маламабільныя групы насельніцтва, МТК – міждзяржаўны тэхнічны камітэт, ТУ – тэхнічныя ўмовы, ПУ – праектны ўзровень, ПШЦП* і інш.).

Такім чынам, беларуская будаўнічая тэрміналогія прадстаўлена разнастайнымі па структуры лексічнымі адзінкамі. Найбольш часта выкарыстоўваецца тэрмін-назоўнік. Разам з тым пашыранымі структурнымі адзінкамі ў галіне будаўнічай тэрміналогіі з’яўляюцца тэрміны-словазлучэнні, сярод якіх пераважаюць двухкампанентныя спалучэнні са значэннем назвы матэрыялаў. Прывядзём наступныя словазлучэнні з тэрмінам *цэмент*: *цэмент алюмінатны, цэмент асфальтавы, цэмент безусадачны, цэмент бяспрымесны, цэмент воданепранікальны, цэмент высокагліназёмісты, цэмент высакамарачны, цэмент высокатрывалы, цэмент высокатэрмічны, цэмент гідраўлічны* і інш.